*М. А. Бяспалая*

# ДУХОЎНАЯ РОЛЯ ЦАРКВЫ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Да такой актуальнай праблемы навукоўцы пачалі актыўна звяртацца не так даўно, фактычна апошнія два дзесяцігоддзі. Сказанае ў першую чаргу трэба аднесці да расійскіх навукоўцаў, якія публікавалі падборкі дакументальных матэрыялаў, манаграфіі, абаранялі дысертацыі па розных аспектах царкоўнай тэматыкі. Як важнейшую крыніцу для раскрыцця нашай тэмы мы разглядаем зборнік дакументаў «Русская православная церковь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг.», які выдадзены ў 2009 г. і ўключае дакументы амаль 20-ці архіваў Расійскай Федэрацыі, Рэспублікі Украіна і Рэспублікі Беларусь. Аб актуальнасці нашай тэмы сведчыць і небывалая папулярнасць выставы, арганізаванай Цэнтральным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Маскоўскай Патрыярхіяй у красавіку–маі 2009 г. і прысвечанай ролі праваслаўнай царквы ў гады вайны.

Па прашэсці 70-ці гадоў пасля пачатку Вялікай Айчыннай вайны падаецца ў пэўным сэнсе сімвалічным, што 22-га чэрвеня 1941 г. выпала на царкоўнае свята Усіх Святых, у зямлі Расійскай прасіяўшых, якія як быццам бы сталі поплеч з абаронцамі роднай зямлі і сваёю духоўнаю сілаю падтрымлівалі іх падчас нечалавечых выпрабаванняў, выпаўшых на іх долю. Нягледзячы на тое, што царква ў СССР была аддзелена ад дзяржавы і афіцыйна як бы і не выконвала прыкметнай ролі, Мітрапаліт Сергій у першы ж дзень вайны звярнуўся з Пасланнем да ўсіх веруючых і благаславіў усіх веруючых на абарону радзімы. Пасланне Мітрапаліта было кароткім, але вельмі змястоўным па духоўным сэнсе, які быў закладзены ў прыкладах з гістарычнага мінулага, звароце да духоўнага прызначэння служыцеляў царквы ў час ваеннага ліхалецця. Працытуем (на мове арыгінала), на наш погляд, адну з важнейшых думак: «Отечество защищается оружием и общим народным подвигом, общей готовностью послужить отечеству в тяжкий час испытания всем, чем каждый может. Тут есть дело рабочим, крестьянам, ученым, женщинам и мужчинам, юношам и старикам. Всякий может и должен внести в общий подвиг свою долю труда, заботы и искусства» [3, с.39].

Мы не маем дакументаў каб адлюстраваць водгукі на Пасланне Мітрапаліта, аднак нам падаецца, што такая пазіцыя праваслаўнай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

царквы выклікала, аб’ектыўна не магла не выклікаць, самы станоўчы рэзананс па ўсёй краіне, таму што перад страшнымі выпрабаваннямі, дзякуючы выразнай патрыятычнай пазіцыі царквы, народ паўставаў адзінай сілай. Хтосьці (улада ці царква) павінен быў зрабіць першы крок да паразумення, гэта зрабіла царква.

Нацыстская прапаганда таксама надавала вялікае значэнне Пасланню Мітрапаліта Сергія. Аб гэтым сведчаць наступныя факты: у верасні 1941 г. за чытанне Паслання ў храмах Кіева немцамі былі растраляны настаяцель і протаіерэй адной з цэркваў, у Сімферопалі – тры служыцелі царквы, у тым ліку адзін манах [3, с.9].

Царкоўныя арганізацыі актыўна падтрымалі Пасланне Мітрапаліта. Да прыкладу, царкоўная абшчына аднаго з сабораў Ленінграда ўжо 24 чэрвеня звярнулася ў гарадскі савет дэпутатаў працоўных з прапановай адкрыць на свае сродкі лазарэт для раненых і хворых воінаў. На гэта абшчына выдзяляла ўсе свае сродкі – 700 тыс. руб. і штомесячна яшчэ па 30 тыс. руб. Па словах кіраўніцтва абшчыны, «в минуты трудно переживаемых обстоятельств военного времени долг каждого гражданина идти навстречу Отечеству в облегчении разного рода затруднений» [3, с.40].

Безумоўна, ніхто не мог уявіць з якімі цяжкасцямі сутыкнуцца жыхары Ленінграда ў дні блакады, але і тады служыцелі культу прадаўжалі выконваць сваю духоўную місію, ні адзін сабор у горадзе не зачыняўся ні ўдзень, ні ўначы. У адзначаным вышэй зборніку прыведзены дакумент, які мы не можам працытаваць поўнасцю, але і асобныя вытрымкі, на наш погляд, раскрываюць трагедыю быцця і веліч подзвігу. Змест дакумента – дапамога служыцеляў і прыхажан Спаса-Прэабражэнскага сабора ленінградцам на працягу двух гадоў блакады, крытэрыям якой з’яўлялася «стремление к созиданию у людей того патриотического подъема, который опрокидывал бы планы врага по моральному расслаблению блокированных ленинградцев» [3, с.65]. У самыя цяжкія дні блакады, лістапад–снежань 1941 г. – студзень–люты 1942 г. у адміністрацыю сабора паступалі пісьмы з просьбаю аб дапамозе, напрыклад, ад спевака А. Галузіна: «Прошу Вас – помогите сколько-нибудь. Я нахожусь в ужасном положении. У меня нет на зиму ни сапог, ни пальто, ни одежды. Неужели я погибну?... Помогите выбраться из ужасной пропасти». Яму была

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

выдзелена матэрыяльная дапамога, праз некаторы час ён пайшоў добраахвотнікам на фронт. Аўтар яшчэ аднаго пісьма І. В. Лебедзеў пісаў: «Я, можно сказать, понемногу умираю. Силы мои подорвались. Одни кожа и кости. Сидим несколько дней на одном хлебе. Конечно, все теперь так существуют, но хочется жить. Со мной вместе голодает жена, дочь и девятилетний внук, отец которого на фронте. Спасите жизнь». Сям’і І. В. Лебедзева былі выдзелены сродкі, аднак было ўжо позна. У студзені 1942 г. у адрас кіраўніцтва сабора накіраваў пісьмо спявак П. І. Большаў: «Я третий день как слег в постель и не могу совершенно встать. Думаю, чувствую, что так и кончу свою жизнь на этом. … Положение мое ужасное. Помогите. Жить еще хочется». Дапамога была аказана, і Пётр Іванавіч стаў байцом Чырвонай Арміі і быў узнагароджаны медалём «За абарону Ленінграда» [3, с.65–66].

Патрыятычная пазіцыя духавенства праяўлялася ў розных варыянтах – ад патрыятычных пропаведзяў і малебнаў аб дараванні перамогі, арганізацыі супрацьпажарнай абароны, бомбасховішчаў непасрэдна ў храме, збору каляровых і каштоўных металаў, цёплых рэчаў, грашовых сродкаў да стварэння з веруючых дружын для будаўніцтва абарончых умацаванняў. Бяспрэчна, самая вядомая духоўная місія царквы – гэта збор сродкаў на абарону. Людзі ахвяравалі хто што мог: на харчовыя пасылкі раненым – яблыкі, бульбу, буракі, агуркі, махорку; для шпіталяў – лыжкі, падушкі, талеркі, паперу, кнігі і многае іншае; для дзеючай арміі – грошы, сямейныя рэліквіі, каштоўнасці на будаўніцтва самалётаў, танкаў і г.д. Для ілюстрацыі выкарыстаем, на наш погляд, вельмі выразны прыклад са звестак аднаго з царкоўных прыходаў г. Курска, з якога 17 верасня 1943 г. у шпіталь было адпраўлена 580 яблыкаў, памідоры, агуркі, 173 шклянкі махоркі [3, с.90]. Разам з тым нельга не звярнуць увагу на імкненне савецкіх органаў не дапускаць зносін духавенства з камандаваннем шпіталяў і раненымі, хаця, здавалася б, усенароднае гора павінна было аб’яднаць людзей, а не раз’ядноўваць па палітычных матывах. У якасці прыкладу нагадаем вытрымку з дакладной запіскі намесніка наркама дзяржаўнай бяспекі СССР Б. З. Кабулава ад 23 мая 1943 г., у якой паведамлялася, што царкоўны савет адной з Калужскіх цэркваў сабраў сярод веруючых 50 000 руб., на іх набылі падарункі для раненых, а таксама плакаты, партрэты кіраўнікоў партыі і ўрада, наймалі цырульнікаў. Сіламі царкоўнага хору ў шпіталі двойчы праводзіліся канцэрты з праграмамі рускіх народных

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

песень і твораў савецкіх кампазітараў. Аднак органы бяспекі прынялі меры каб не дапусціць у будучым кантактаў духавенства з персаналам шпіталяў і раненымі пад відам шэфства [3, с.186–187].

Сітуацыя ў адносінах паміж царквою і савецкаю дзяржаваю пачала паступова мяняцца ў лепшы бок з верасня 1943 г. пасля абрання Патрыяршага месцаахоўніка Мітрапаліта Сергія Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі і аднаўлення дзейнасці Сінода праваслаўнай царквы. Адносіны не пагоршыліся і пасля таго, як стала вядома, што з 26-ці іерархаў праваслаўнай царквы, якія былі арыштаваны як ворагі савецкай улады і вызваліць якіх пагадзіўся І.В.Сталін, у жывых застаўся толькі адзін – епіскап Мікалай. Аднак аналіз адносін царквы і дзяржавы не з'яўляецца мэтай нашага артыкула.

Самая прыкметная патрыятычная акцыя праваслаўнай царквы – збор сродкаў на танкавую калону імя Дзмітрыя Данскога, які пачынаецца са студзеня 1943 г. і « …не осталось ни одного храма, ни одной церковной общины во всей стране, которые были бы в стороне от этого священного дела служения Родине в годину тяжелых испытаний. Все спешили, благородно соревнуясь друг с другом, вложить в дело всецерковного сбора весь свой патриотический энтузиазм, всю свою ненависть к фашистским разбойникам» [3, с.97]. У сакавіку 1944 г. танкавая калона з сарака машын была перададзена Чырвонай арміі. На урачыстым мітынгу прадстаўнік кіраўніцтва царквы запэўніў танкістаў: «Духом с вами будем все мы, весь наш советский народ во всех ваших бранных подвигах. Мы пламенно молимся о победе нашего оружия и пламенно веруем в конечное торжество свободы, правды, мира…» [3, с.98].

Нельга коратка не спыніцца і на непасрэдным удзеле праваслаўных святароў у баявых дзеяннях, якія былі прызваны ў Чырвоную армію, праўда, не ў ролі духоўных пастыраў. Расійскі даследчык М. В. Шкароўскі прыводзіць цікавыя звесткі, якія мы выкарыстаем. У дзеючай арміі змагаўся з ворагам С. М. Ізвекаў, будучы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Пімен, да 1943 г. знаходзіўся на фронце будучы Метрапаліт Калінінскі Алексій, усю вайну прайшоў архімандрыт А. Воранаў, у Сталінградзе змагаўся протаіерэй Б. Васільеў, сяржант Я. Паўлаў, што ўзначальваў абарону аднаго з дамоў у Сталінградзе, якая ўвайшла ў гісторыю як абарона «дома Паўлава», да вайны быў манахам [4, с.121]. Трэба дадаць, што за патрыятычную дзейнасць у гады вайны некаторыя з

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дзеячаў праваслаўнай царквы атрымалі ўзнагароды ад савецкага ўрада. Патрыярх Сергій быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, другія – медалямі «За абарону Масквы», «За абарону Ленінграда», «За баявыя заслугі» [1, с.20]. Да месца будуць звесткі аб тым, што напярэдадні 60-годдзя Перамогі каля двух тысяч прадстаўнікоў Рускай Праваслаўнай Царквы былі ўзнагароджаны за ўдзел у баявых дзеяннях і патрыятычнае служэнне.

Аднак зусім другая сітуацыя склалася за лініяй фронту, на акупіраванай тэрыторыі. У поўны рост тут паўставала праблема свабоды сумлення, якую кожны царкоўны дзеяч разумеў па-свойму і будаваў свае паводзіны ў адпаведнасці з гэтым. Мы не будзем засяроджваць увагу на фактах супрацоўніцтва вышэйшых іерархаў царквы на акупіраваных тэрыторыях з новымі ўладамі, таму што праблема гэта надзвычай складаная і далікатная, да таго ж яна не з'яўляецца нашай задачай. Мы паспрабуем адлюстраваць духоўны подзвіг тых святароў, што засталіся са сваім народам у час выпрабаванняў, якіх не ведала гісторыя.

Пры ажыццяўленні сваёй палітыкі на чужой зямлі акупанты мала лічыліся з пачуццямі веруючых, хаця нямецкая прапаганда запэўнівала ў адваротным. У загадзе начальніка штаба Вярхоўнага Галоўнакамандуючага вермахта ад 6 жніўня 1941 г. указвалася «Не садзейнічаць і не мяшаць рэлігійнай ці царкоўнай дзейнасці грамадзянскага насельніцтва» [3, с.523]. Начальнік паліцыі бяспекі і СД у дакуменце з грыфам «Сакрэтна, справа імперскай важнасці» ад 16 жніўня 1941 г. падкрэсліваў: «Садзейнічанне праваслаўнай царкве таксама не пажадана. Справа не ідзе аб адраджэнні ранняй патрыярхальнай рускай царквы. …пажаданы раскол на асобныя царкоўныя праваслаўныя групы» [3, с.525]. Дакументы захоўваюць звесткі аб фактах знішчэння акупантамі мірных жыхароў прама ў царкве, як гэта адбылося ў палескіх вёсках Малая Плотніца і Жытча, у в. Доры Валожынскага р-на і інш. Калі ў 1942 г. карнікі жывымі спалілі ў царкве 300 жыхароў в. Хорастава, што на Міншчыне, разам з імі быў святар Іаан Лойка, які да апошняга прадаўжаў прычашчаць людзей. Былі жорстка замучаны святары Уладзімір Назарэўскі і Аляксандр Валасевіч, якія адмовіліся супрацоўнічаць з акупантамі.

Наколькі мае сэнс вядомае выслоўе аб тым, што ў жыцці заўсёды ёсць месца духоўнаму подзвігу, паказваюць паводзіны святара Свята-Петрапаўлаўскай царквы ў Ружанах Іаана Наўроцкага ў першыя дні вайны, калі толькі яго рашучасць дапамагла захаваць многія жыцці. Менавіта айцец Іаан атрымаў

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дазвол нямецкага камандавання на пахаванне загінуўшых і вынесці параненых з поля бою. На гэтую богаўгодную акцыю ён падняў усіх жыхароў Ружан і навакольных вёсак, а параненых аперыравалі прама ў царкве, «пад абразамі», як гаварылі людзі. Па сённяшні дзень жыхары пасёлка перадаюць з пакалення ў пакаленне ўспамін аб яшчэ адным учынку свайго святара, калі ён паручыўся за ружанскіх мужчын, якіх беспадстаўна абвінавацілі ў забойстве нямецкага салдата, і як гарантыю невінаватасці сваёй паствы ён прапанаваў немцам у якасці заложнікаў сваю жонку і дзвюх малалетніх дачушак. Шмат іншых добрых спраў здзейсніў айцец Іаан у гады акупацыі, яго духоўны подзвіг увекавечаны ў сэрцах многіх людзей [2, с.8–9].

На часова акупіраванай тэрыторыі царкоўныя служыцелі прымалі ўдзел ва ўзброенай барацьбе. На тэрыторыі Беларусі гэта датычыцца ў першую чаргу заходніх абласцей, таму што ва ўсходніх цэркваў не было, а значыць, не было і святароў. Дакументы захавалі факты супрацоўніцтва служыцеляў культу з партызанамі: напрыклад, святар з Палескай вобласці Аляксандр Раманушка з 1942 г. па 14 ліпеня 1944 г. падтрымліваў сувязь з партызанамі, быў узнагароджаны партызанскім медалём. Дапамагаў партызанам і Яўген Крокас, святар з в. Мілевічы Пінскай вобласці. Вышэй мы расказвалі аб духоўным подзвігу айца Іаана Лойкі з в. Хорастава, навакольныя лясы якой сталі асноўнай базай партызанскага злучэння, якім камандаваў генерал-маёр Герой Савецкага Саюза В. З. Корж. Змагацца з ворагам у адным з партызанскіх атрадаў злучэння і направіў сваіх сыноў святар Іаан Лойка.

Аб двух святарах з Заходняй Беларусі маюцца матэрыялы ў згаданым вышэй зборніку. Адзін з іх – Васіль Данілавіч Капычка быў настаяцелем храма ў в. Адрыжын Драгічынскага р-на, у гады вайны з'яўляўся сувязным партызанскай брыгады імя В. М. Молатава. (Не магу не напісаць аб тым, што ў гэтай брыгадзе змагаўся і мой бацька.) У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь знаходзіцца дакумент, у якім святар заяўляе, што ў «інтарэсах канчатковага разгрому фашызму бяру абавязак працаваць на карысць Радзіме» [3, с.58]. За заслугі перад радзімай айцец Васіль быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, некалькімі медалямі [3, с.709]. Другі – Віктар Васільевіч Бекарэвіч займаў царкоўныя пасады ў Вілейскім р-не і Стоўбцах, у Айчынную вайну ён выконваў заданні партызан і Маладзечанскага

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

падпольнага райкама партыі, за што быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і баявымі медалямі [3, с.685].

У якасці заключэння мы адзначаем, што духоўная роля праваслаўнай царквы на працягу Вялікай Айчыннай вайны праяўлялася ў патрыятычным служэнні сваёй Радзіме падчас усенароднай барацьбы з ворагам. Гэтую ролю кіраўніцтва царквы акрэсліла ў першы дзень вайны ў Пасланні Мітрапаліта Сергія, галоўная ідэя якога зыходзіла з прадвызначэння царквы як духоўнага пастыра. Дадатковым момантам шырокага рэзанансу, які атрымала пасланне, і не толькі сярод веруючых, быў сам факт існавання царквы ва ўмовах поўнай дзяржаўнай ізаляцыі. Пасланне дэманстравала, што ў любых абставінах царква павінна заставацца з народам. Выкарыстаныя ў артыкуле прыклады патрыятычнай дзейнасці служыцеляў царквы рознага ўзроўню, на наш погляд, дастаткова выразна адлюстроўваюць духоўную ролю царквы, духоўны і грамадзянскі подзвіг яе асобных служыцеляў у гады Вялікай Айчыннай вайны.


1. *Журнал* Московской Патриархии. – 1944. – № 10. – С. 17–24.

2. *Крапивин, С.* Праведник // Советская Беларусь, 8 июня 2005 г.

3. *Русская* православная церковь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг.: сб. документов / состав.: О. Ю. Васильева, И. И. Кудрявцев, Л. А. Лыкова. – М.: Изд-во Крутицкого подворья, 2009. – 627 с.

4. *Шкаровский, М. В.* Русская православная церковь при Сталине и Хрущеве / М. В. Шкаровский. – М., 1999. – 473 с.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ